Надзея Ясмінска

# Прыкры Крыўс



Ілюстрацыі Святланы Міхалап

ПАПУРЫ
Мінск



Калі б хтосьці сказаў Стасю «Добры дзень!», то хлопчык не пагадзіўся б: які ж гэты дзень добры?

Зусім нядобры, нават нікуды не варты. Не заладзіўся ад самага пачатку.

— Трэба запіць яго какавай, — нарэшце пастанавіў Стась.

Ды ледзь ён глытнуў гарачы, салодкі, духмяны напой, як адразу выплюнуў. Ну і гаркота!

Што ж такое дзеецца?

Раптам Стась пачуў нейкую валтузню. Прыгледзеўся — і ажно рот разявіў. Ён убачыў дзіўную істоту, якая сядзела на рандэльку, апусціўшы ў какаву хвост.

— Ты хто? — спытаў хлопчык.

— Кры-ы, — пачулася ў адказ. — Я — Крыўс!

— А што ты тут робіш?

Але Крыўс толькі зарагатаў ды шпарка скочыў прэч.



Стась падумаў, что ў яго разгулялася ўяўленне, як часам бывае пасля мульціка ці займальнай кніжкі. Аднак піць какаву болей не наважыўся. Лепей пагуляць у нешта. Хаця б мяч пакідаць!

Ён пайшоў у іхні з братам пакой: там быў спартыўны куток, дзе вісеў кошык. Стась умеў трапляць туды мячом і з трох крокаў, і з пяці, і з-за спіны, і з заплюшчанымі вачыма. Але гэтым разам нічога не атрымалася. Мяч зрабіўся цяжкім і няспрытным. Замест таго каб ляцець у кошык, ён прамахнуўся, стукнуўся аб сцяну і лупануў хлопчыка проста ў лоб!

— Ай! — крыкнуў Стась, схапіўшыся за галаву.



А міма прашмыгнула тая самая пачварынка і з гігіканнем пакруціла мяч на хвасце.

— Смяешся з мяне? — абурыўся хлопчык.

— Кры-ы! — адказаў яму Крыўс.









«Калі ты з’явіўся з кніжкі, — разважаў Стась, — то мне такая кніжка не падабаецца. Лепей пачытаю іншую!»

Але і тут пайшло так-сяк накасяк. Фатэль быццам набілі пілавіннем. А літары ў кніжцы скакалі, як шалёныя, чапляліся адна за адну і блыталіся. Толькі потым Стась заўважыў, што гэта Крыўс усунуў хвост між старонак.

— Прэч адсюль! Ты ўсё псуеш!

— Кры-ы! — аніколечкі не спужаўся Крыўс.



